УДК 947.6 —1917 – 1918 : 321. 74

Р.Р. Лазько

Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны

# ПАЛІТЫКА САВЕЦКАЙ РАСІІ АДНОСНА БЕЛАРУСІ І УКРАІНЫ Ў ПЕРШЫ ГОД БАЛЬШАВІЦКАЙ ДЫКТАТУРЫ: ПАРАЛЕЛІ І РАЗЫХОДЖАННІ

Урад Савецкай Расіі пачынаў сваю палітыку адносна Ўкраіны і Беларусі па агульным сцэнарыі, асноўнай ідэяй якога было растварэнне нацыянальных арганізацый у сістэме саветаў. Правал гэтага сцэнарыя ў снежні 1917 г. і розны характар сацыяльнай апоры бальшавікоў ва Ўкраіне і Беларусі прымусіў ленінскі ўрад прыняць асобныя варыянты палітыкі на ўкраінскім і беларускім накірунках. З вясны 1918 г. да фактараў, вызначаўшых разыходжанні ў гэтай палітыцы, далучыўся неаднолькавы юрыдычны статус Украіны і Беларусі ва ўмовах германскай акупацыі. Аднак інструментальны характар беларускай і ўкраінскай палітыкі Савецкай Расіі не змяніўся. Рэанімірованая ў сучаснай гістарыяграфіі і напоўненая новым зместам чоткая савецкая формула —Ленін і Сталін – арганізатары БССР [1] можа сѐння служыць падказкай даследчыкам адпаведнай праблемы. Аднак яе праўдзівасць павярхоўная. Яна не дае адказу на пытанні аб прычынах і ўмовах, у якіх кіраўніцтва Савецкай Расіі, што складалася з бальшавікоў-інтэрнацыяналістаў, адэптаў сусветнай рэвалюцыі, прыйшло да рашэння аб стварэнні фікцыі беларускай нацыянальнай дзяржавы ў форме савецкай рэспублікі. Паглыбіць разуменне гэтых прычын і гістарычных умоў дазваляе разгляд працэсу зараджэння беларускай савецкай рэспублікі ў цеснай сувязі з аналагічным працэсам ў Украіне. Але чаму ў гэтай сувязі? Справа ў тым, што Ўкраіна была адным з тых рэгіѐнаў былой Расійскай імперыі, дзе рэчаіснасць прымусіла бальшавіцкі ўрад з першых дзѐн яго існавання перайсці ад лозунгаў да справы ў нацыянальнай палітыцы. Асноўным кампанентам гэтай рэчаіснасці было хуткае фарміраванне руху да аддзялення Украіны ад Расіі на аснове права народаў на самавызначэнне – ідэі, да якой уплывовыя ў Украіне сацыялістычныя партыі, у адрозненне ад бальшавікоў, ставіліся прынцыпова і прагматычна. Даследаванне палітыкі расійскага бальшавіцкага ўрада адносна Беларусі з улікам іх палітыкі на ўкраінскім геапалітычным полі стварае выдатную магчымасць выявіць адпаведнасць названай ідэі як прапагандысцкага лозунга рэальным мэтам нацыянальнай палітыкі бальшавікоў, прасачыць фарміраванне механізма гэтай палітыкі і лепш зразумець яе сутнасць у дачыненні да Беларусі. Вагу ўкраінскага крытэрыя для ацэнкі гэтай палітыкі павышае эканамічнае і стратэгічнае значэнне Ўкраіны для расійскай дзяржавы. Тут знаходзіўся шэраг яе важных эканамічных цэнтраў, яе выхад да паўднѐвых мораў, стратэгічныя граніцы. Галоднай і халоднай зімой 1917 - 1918 гг. нялѐгка было абыйсціся без украінскага хлеба і вугалю. Кантроль над Украінай меў і вялікае палітычнае значэнне, з'яўляючыся сведчаннем здольнасці бальшавікоў падпарадкаваць сабе Расію ў цэлым і пашырыць яе ўплывы за этнічна рускія межы пад сцягам сусветнай рэвалюцыі. Па ўсіх гэтых прычынах магчымая страта Ўкраіны моцна трывожыла бальшавіцкі ўрад. А сітуацыя вяла якраз у гэтым накірунку. Абвясціўшы 7(20) лістапада Ўкраіну самастойнай народнай рэспублікай (УНР), украінская Цэнтральная Рада паспяхова стварала атрыбуты нацыянальнай дзяржаўнасці. Яна ўжо далѐка прайшла па шляху фарміравання адной з апор гэтай дзяржаўнасці – нацыянальнага войска, 16 лістапада прыняла закон аб выбарах ва Ўкраінскі ўстаноўчы сход на аснове ўсеагульнага, роўнага і прамога выбарчага 84 права пры тайным галасаванні [2, с. 223]. Інакш гаворачы, яна поўным ходам рэалізавала лозунг аб нацыянальным самавызначэнні. Пры гэтым украінскія лідары не адмовіліся ад ідэі федэрацыі ўсіх дзяржаўных утварэнняў на тэрыторыі былой Расійскай імперыі, настойваючы, аднак, на тым, што кіраваць ѐю мусіць федэратыўны орган, які будзе абапірацца на ўсе сацыялістычныя партыі, існаваўшыя на гэтых тэрыторыях. 23 лістапада Генеральны сакратарыят (урад) УНР звярнуўся да існаваўшых рэгіянальных урадаў і Саўнаркама Расіі з прапановай пачаць у Кіеве перагаворы аб стварэнні на гэтай аснове ўрада федэратыўнай Расійскай рэспублікі [3, с.136]. Такім чынам, урад УНР фактычна перахапіў у ленінскага ўрада ініцыятыву ў справе перабудовы Расіі: у той час, як

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

ленінскі ўрад спыніўся на —Дэкларацыі правоў народаў Расіі  ад 2 лістапада, пераўтвараючы яе ў зборнік палітычных лозунгаў, украінскі ўрад прыступіў да яе практычнай рэалізацыі. Пераход нацынальных рухаў народаў Расіі да рэалізацыі свайго права на самавызначэнне і стварэнне нацыянальных дзяржаў стаў адным з шэрагу фактараў, якія дапамаглі Леніну ясна ўсвядоміць недастатковасць той падтрымкі, якую яго партыя мела ў сталіцы, для заваявання ўсѐй Расіі. Другім была пазіцыя саветаў сялянскіх дэпутатаў, выражаная ў асуджэнні бальшавіцкага перавароту Выканкамам іх Усерасійскага савета. Усведамляючы слабасць уплываў партыі ў правінцыяльнай Расіі, група членаў бальшавіцкага ЦК і ленінскага ўрада дзеля іх расшырэння патрабавала стварыць кааліцыйны сацыялістычны ўрад. Ленін рашуча выступіў супраць. Некалькі членаў ЦК і ленінскага ўрада ў знак пратэсту супраць гэтай пазіцыі пакінулі свае пасты. Савецкая Расія ўвайшла першы пасля прыходу бальшавікоў да ўлады палітычны крызіс. У гэты крытычны для бальшавіцкай улады момант Ленін ініцыіраваў перавыданне сваѐй брашуры, напісанай восенню, —Удержат ли большевики государственную власть?  У прадмове да яе, якая мае дату 9 лістапада, ѐн так адказваў на пастаўленае ў загалоўку пытанне: —Не словамі, а справай цяпер трэба адказваць на гэта пытанне.  Сярод гэтых спраў ѐн ставіў на першыя месцы - акрамя, зразумела, дасягнення міру - —неадкладныя і рэвалюцыйныя меры супраць памешчыкаў, неадкладнае аднаўленне поўнай свабоды для Фінляндыі, Украіны, Беларусіі, для мусульман і г. д.  [4, с. 289, 299, 300]. Названыя меры мусілі мець дэманстратыўны эфект, спрыяць заваяванню даверу да ўзяўшай уладу партыі. Здавалася б, на першы погляд, што прапанова, выказаная Генеральным сакратарыятам УНР, ішла насустрач пазіцыі, выказанай кіраўніком Саўнаркама, бо была крокам да —поўнай свабоды няпоўнапраўных народаў Расіі. Але на справе было наадварот. Прапанова ўкраінскага ўрада не магла быць прынятая перамогшай у савецкім кіраўніцтве ленінскай групай пасля таго, як яна адкінула ідэю аб кааліцыі сацыялістычных партый пры фарміраванні савецкага ўрада ў Петраградзе. Прыняць тую ж самую ідэю як палітычную аснову федэрацыі народаў Расіі азначала б дэзавуіраваць яе тагачасную палітыку. Не магло ленінскае кіраўніцтва прыняць гэту ідэю яшчэ і таму, што было не ўпэўнена ў сваѐй здольнасці кантраляваць федэратыўныя органы, калі б яны ствараліся знізу, пры роўнапраўным удзеле ўсіх патэнцыяльных суб'ектаў федэрацыі. Гэта ясна засведчылі вынікі выбараў ва Ўстаноўчы сход, якія бальшавікі прайгралі. Такім чынам, як прызнаваў Сталін, паміж Саўнаркамам і ўкраінскім урадам узнікла разыходжанне па пытанні аб уладзе [5, с. 7 - 8], ды не толькі ў Украіне, але і ва ўсѐй Расійскай рэспубліцы. Так склаўся грунт для канфлікта, ад вырашэння якога залежаў лѐс будучай федэрацыі – не толькі яе форма, але і яе рэальны палітычны змест. Саўнаркам паспрабаваў нейтралізаваць свайго ўкраінскага саперніка, абраўшы адносна яго тактыку —растварэння  нацыянальных арганізацый у сістэме саветаў, у якіх бальшавікі мелі моцныя ўплывы. Такая тактыка ясна праглядваецца ў размове Сталіна па прамым провадзе з членам украінскага нацыянальнага ўрада, левым украінскім эсэрам Н. В. Поршам 17 (30) лістапада 1917 г. Ад імя Саўнаркама Сталін выказаў згоду на перабудову Расійскай рэспублікі на федэратыўных асновах, калі за гэта выкажацца нацыянальны (у гэтым выпадку - украінскі) Устаноўчы сход. Для ленінскага Саўнаркама, аднак, было важна, 85 каб —улада ў краі (ў Украіне - Р. Л.), як і ў іншых абласцях (выдзелена намі - Р.Л.) знаходзілася ў руках усѐй сумы рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў, уключаючы сюды і арганізацыі Рады  [6, с. 52] . У кантэксце гэтай пазіцыі ленінскага ўрада неабходна разглядаць і рашэнне Саўнаркама ад 2 снежня 1917 г. аб падтрымцы ініцыятывы Беларускага абласнога камітэта (БАК) пры Ўсерасійскім сялянскім савеце аб правядзенні Ўсебеларускага з'езда. Першае, на што неабходна звярнуць увагу, чытаючы паведамленне петраградскіх —Известий  аб дасягнутым пагадненні, гэта характарыстыка БАК —як чыста сялянскай арганізацыі, якая стаіць на грунце канфіскацыі памешчыцкіх зямель і прызнання савецкай улады ў цэнтры і на месцах  [7, 6 дек.]. Здавалася б, што ў Заходняй вобласці, дзе толькі што бальшавікі здабылі пераканаўчую перамогу на выбарах ва Ўстаноўчы сход, у іх не было падстаў трывожыцца наконт масавай падтрымкі сваѐй улады. Але гэта ўражанне падманлівае. Іх масавая база тут – гэта амаль цалкам служачыя франтавых і тылавых арганізацый Заходняга фронта, а не мясцовае насельніцтва, што неаднаразова прызнавалі самі бальшавікі [ 8, с. 217]. Па

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

меры таго, як развальваўся фронт, знікала і масавая падтрымка. У гэтай сувязі звернем увагу на адно важнае сведчанне старшыні БАК Яўсея Канчара аб перагаворах бакаўцаў з Леніным і Сталіным, зробленае па свежых слядах, у 1918 г., наконт стварэння ―Беларускай народнай Савецкай Рэспублікі . ―Арганізуйце [яе], калі за вамі ідуць беларускія сяляне і рабочыя, - сказаў Сталін, - гэта для нас лепш, бо нам патрэбна сур'ѐзная апора, і калі вы створыце гэту апору і ўхіліце тыя дэфекты, якія ѐсць цяпер (г. зн. у снежні 1917 г.) на месцы ў Мінску (гаворка ідзе аб ―Савеце камісараў Заходняй вобласці , - удакладняў Канчар), то Савет народных камісараў нічога іншага жадаць не будзе [9, с. 90]. Відавочна, бальшавіцкае кіраўніцтвам абрала адносна Беларусі варыянт той самай тактыкі ―растварэння нацыянальных арганізацый у сістэме саветаў, які яно спрабавала рэалізаваць на Ўкраіне да 4 снежня 1917 г., да таго моманту, калі правалілася яго задумка ў пэўным сэнсе ―украінізаваць і легалізаваць бальшавіцкія саветы праз Усеўкраінскі з'езд саветаў рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў, які адкрыўся ў гэты дзень. Заўважым, што Сталін у размове з Поршам выказваўся не толькі аб Украіне. Для ленінскага Саўнаркама было важна, каб ―улада… і ў іншых абласцях знаходзілася ў руках усѐй сумы рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў , уключаючы і арганізацыі Рады. Ідэя аб магчымасці супрацоўніцтва бальшавікоў з дэмакратычнымі нацыянальнымі арганізацыямі мела не ўкраінскае, а агульнарасійскае прызначэнне, і рэалізавалася ў раѐнах, дзе яны не мелі дастатковай апоры. Аднак абраная ЦК РСДРП(б) і Саўнаркамам тактыка ―растварэння і падпарадкавання нацыянальных дэмакратычных арганізацый правалілася - спачатку ў Украіне - 4 снежня і ў наступныя дні, - а неўзабаве і ў Беларусі. Бальшавіцкай меншасці Ўсеукраінскага з'езда саветаў, не здолеўшай абаперціся на ўзброеную сілу, давялося пераязджаць з Кіева ў Харкаў, правесці там асобны з'езд і ствараць другую, савецкую Украіну. А ў Беларусі быў рэалізаваны іншы сцэнарый: не здолеўшы стварыць на Ўсебеларускім з'ездзе дастаткова трывалай апоры, затое маючы ў краі значныя ваенныя сілы, бальшавікі, навучаныя ўкраінскім вопытам, проста разагналі з'езд. Яго разгону паспрыяла пераўтварэнне тэрыторыі Беларусі ў важны плацдарм мабілізацыі сіл для барацьбы з украінскай Радай пасля нарады ў Стаўцы, праведзенай 7 снежня з удзелам тэрмінова прыехаўшага сюды Антонава-Аўсеенкі. Бальшавікі дзейнічалі ў Беларусі як на прыфрантавой тэрыторыі, а фротам сталі ўсходнія раѐны Ўкраіны. Выкарыстаўшы рэпрэсіі, яны ўтрымалі ўладу, але на нейкі час адштурхнулі ад сябе невялікую группу мясцовых ―бальшавізаваўшыхся нацыянальных дзеячаў і вымушаны былі падтрымліваць сваю ўладу ў краі выключна ваеннай сілай. Так скончыўся кароткі першы этап у нацыянальнай палітыцы Савецкай Расіі і пачаўся новы. Фактарамі, вызначыўшымі яго змест, былі далейшая таталітарная эвалюцыя савецкай улады, якая знайшла адлюстраванне ў разгоне Ўстаноўчага сходу 5 студзеня 1918 86 г., а таксама развязванне бальшавікамі грамадзянскай вайны ва Ўкраіне супраць Цэнтральнай Рады, правал спробаў выкарыстаць лозунг самавызначэння народаў для недапушчэння акупацыі Германіяй новых тэрыторый былой Расійскай імперыі, спыненне ѐю перамір'я і пашырэнне акупацыі да лініі Пскова, Полацка і Дняпра. Як і ў першыя месяцы савецкай улады, ―маторам яе нацыянальнай палітыкі заставаўся кіраўнік Саўнаркама У. І. Ленін. Яго публіцыстыка з мяжы 1917 – 1918 гг., складзеныя ім нарматыўныя дакументы савецкай улады дазвалююць сцвярджаць, што перабудова нацыянальных адносін у Расіі па-ранейшаму разглядалася ім як адна з важнейшых умоў перамогі гэтай улады. Разам з тым, набыты за першыя месяцы даволі супярэчлівы, хутчэй негатыўны вопыт нацыянальнай палітыкі дазволіў яму лепш асэнсаваць складанасць гэтай сферы і тыя пагрозы для савецкай улады, якія ў ѐй хаваліся. У напісанай ім падчас кароткачасовага водпуску ў Фінляндыі працы ―Из дневника публициста» (фактычна гэта быў план работ на бліжэйшы час) ѐн пытаўся: ―Як ―заваѐўваць на бок Расійскай сацыялістычнай рэспублікі Саветаў іншыя нацыі наогул і нацыі, якія прыгняталіся да гэтага вялікаросамі, у асаблівасці? [11, с.188]. У гэтым пытанні мы бачым, з аднаго боку, выраз прызнання Леніным невялікай эфектыўнасці намаганняў, зробленых да таго часу савецкай уладай, каб забяспечыць падтрымку ѐй нацыянальных ускраін, а з другога боку – характэрную для яго ўвязку ўнутранай нацыянальнай палітыкі з праблемай вываду сацыялістычнай рэвалюцыі за межы адной краіны, пераўтварэння яе ў сусветную. Першым

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

практычным вынікам ленінскага роздуму аб набытым вопыце нацыянальнай палітыкі быў адыход ад дэмакратычнай ідэі права нацый на самавызначэнне, ляжаўшай у яе аснове, да палітыкі на аснове сацыялістычнага прынцыпа самавызначэння рабочых і сялян Расіі. Гэты паварот фіксаваўся ў —Декларации прав трудящегося и эксплуатируемого народа», прапанаванай Устаноўчаму сходу 5 студзеня 1918 г., адхіленне якой і паслужыла зачэпкай для яго роспуску. У ѐй сярод іншых задач Устаноўчаму сходу было прапанавана заняцца стварэннем асноў —федэрацыі савецкіх рэспублік Расіі  на грунце самавызначэння рабочых і сялян кожнай нацыі [11, с. 223]. Гэта ідэя была пакладзена і ў аснову рашэнняў Трэцяга з'езда Саветаў, які адбыўся ў сярэдзіне студзеня. Неабходнасць для ленінскага ўрада засяродзіцца на барацьбе за мір з Германіяй прывяла да непрацяглага зацішша ў вобласці нацыянальнай палітыкі. Аднак у сярэдзіне сакавіка яго актыўнасць ў гэтай вобласці зноў аднавілася. Як і ў першыя месяцы савецкай улады, гэтая актыўнасць была абумоўлена, перш за ўсѐ, ленінскім перакананнем у тым, што перабудова нацыянальных адносін у Расіі на аснове федэрацыі з'яўляецца сродкам аднаўлення рэальнага адзінства дзяржавы. Асаблівую вагу поглядам Леніна на гэты конт надавала тая акалічнасць, што яны выказваліся ім ў сувязі з распрацоўкай праграмных дакументаў дзейнасці партыі і ўрада – у адным з накідаў праекта праграмы партыі [12, с. 73] і ў варыянце артыкула —Очередные задачи Советской власти  [12, с. 151]. Такім чынам, гэтая ідэя стала для Леніна і яго ўрада стратэгічнай і ў гэтай якасці яна з'явілася дырэктывай для дзейнасці сталінскага Наркамата па справах нацыянальнасцей. Пры гэтым, праводзячы яе ў жыццѐ, Сталін настойліва падкрэсліваў, што федэрацыя можа быць створана толькі на аснове савецкай улады на месцах [5, с. 66 – 73, 74 – 78]. Заўважым, што на новым этапе шляхі нацыянальнай палітыкі Савецкай Расіі ў Украіне і Беларусі разыйшліся, што было абумоўлена, у першую чаргу, розніцай юрыдычнага статуса абедзвюх тэрыторый у сістэме германа-расійскага мірнага ўрэгулявання. Адпаведна Брэсцкаму міру Савецкая Расія абавязалася прызнаць мірны дагавор з дзяржавамі Чацвярнога саюза, падпісаны Украінскай Народнай Рэспублікай (УНР) і заключыць з ѐю свой мірны дагавор [13, с. 365 – 370] як з суб'ектам міжнароднага права. З гэтага вынікала і неабходнасць устанаўлення ўкраінска-расійскай дзяржаўнай граніцы. Становішча Беларусі пасля заключэння Брэсцкага міру было прынцыпова іншым. Фактычна Германія і Савецкая Расія падзялілі яе, праігнараваўшы імкненне беларускага палітычнага прадстаўніцтва – Рады Ўсебеларускага з'езда – прыняць удзел у перагаворах дзеля абароны 87 інтарэсаў беларускага народа. Германія прымусіла Расію адмовіцца ад паўночна-заходняй часткі Беларусі, якую яна перадала Літве, але Цэнтральная і Усходняя яе часткі да Дняпра і Заходняй Дзвіны юрыдычна заставаліся часткай Расійскай дзяржавы, часова акупаванай Германіяй да заключэння ўсеагульнага міру. Фактычна гэтая тэрыторыя стала закладам пад тую кантрыбуцыю, якую Расія абавязвалася выплаціць Германіі . Такім чынам, з прававога пункту гледжання розніца становішча большай часткі Беларусі, акупаванай Германіяй, у параўнанні з Украінай, заключалася ў тым, што Ўкраіна была самастойнай дзяржавай, хоць і прыняўшай пратэктарат Германіі, а Беларусь заставалася часткай Расійскай дзяржавы, часткова выведзенай з-пад расійскай юрысдыкцыі. Гэтая розніца вызначыла і рознае стаўленне расійскага савецкага ўрада да Ўкраіны і Беларусі. Не жадаючы назаўсѐды змірыцца з панесенымі тэрытарыяльнымі стратамі, спадзеючыся на будучую германскую рэвалюцыю як на кардынальнае рашэнне тэрытарыяльнай праблемы, спрыяючы ѐй, урад Савецкай Расіі ў той жа час быў вымушаны выпрацоўваць розныя для Ўкраіны і Беларусі спосабы набліжэння той сітуацыі, калі вяртанне страчаных тэрыторый будзе магчымым. Эфектыўным сродкам барацьбы за вяртанне Украіны было —выцісканне  нямецкіх акупантаў (фармальна – саюзнікаў УНР) з яе тэрыторыі шляхам разгортвання партызанскага вызваленчага руху. Аднак ініцыіраваць і накіроўваць гэты рух ад свайго імя ЦК РКП(б) і СНК не маглі, бо гэта немінуча вяло да зрыву —мірнай передышки  ў адносінах з Германіяй і да прагназаванага Леніным краху савецкай улады [11, с. 249 – 250]. Па ініцыятыве У.Леніна была прынята тактыка —мір для Расіі, вайна на Ўкраіне , што азначала неабходнасць для украінскіх бальшавікоў арганізаваць барацьбу супраць акупантаў ад свайго імя, не правакуючы Германію на вайну супраць Савецкай Расіі [14, с. 199 – 200; 15, с. 53], а гэта, у сваю

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

чаргу, патрабавала фармальнага аддзялення як Украінскай Савецкай Рэспублікі ад РСФСР, так і ўкраінскай бальшавіцкай арганізацыі ад РКП(б). Пераадолеўшы моцнае супраціўленне з боку ўкраінскіх бальшавікоў-інтэрнацыяналістаў, ленінскі Саўнаркам на працягу вясны 1918 г. дамогся як фармальнага аддзялення камуністычнай арганізацыі Украіны ад РКП(б), так і абвяшчэння незалежнасці Савецкай Украіны ад Савецкай Расіі. У Беларусі Савецкая Расія не мела патрэбы хавацца за шырмай фармальна незалежнай беларускай савецкай рэспублікі і нават асобнай камуністычнай партыі. Дастаткова было ўпотай падтрымліваць антыакупацыйны рух у Беларусі (які, між іншым, узнікаў стыхійна і набываў вострыя формы ўзброенага супраціўлення), каб прымусіць немцаў скараціць тэрміны акупацыі. Гэтую ролю магла выканаць тэрытарыяльная арганізацыя бальшавікоў — Паўночна-Заходняя, кіраўніцтва якой перад акупацыяй немцамі Мінска перамясцілася ў Смаленск. Савецкі ўрад улічваў гэтую розніцу сітуацыі на беларускім і ўкраінскім напрамках сваёй нацыянальнай палітыкі, калі вясной 1918 г. пад прымусам вынікаў Брэсцкага міру з новай энергіяй ўзяўся за перабудову Расіі на аснове савецкай федэрацыі. У сакавіку— красавіку 1918 г. І. Сталін неаднаразова выступаў у друку на гэтую тэму і нарэшце 3 і 4 красавіка на старонках —Праўды апублікаваў урадавы праект федэралізацыі Расіі. Адпаведна сталінскай схеме, Расійская Федэрацыя павінна была стаць —саюзам канкрэтных гістарычна вылучыўшыхся тэрыторый, якія адрозніваюцца як асобным бытам, так і нацыянальным складам [5, с. 68]. Ён пералічыў шэраг такіх суб'ектаў будучай федэрацыі, прапанаваў падзел паўнамоцтваў паміж яе федэральнымі (—цэнтральнымі ) органамі і абласнымі, намеціў канструкцыю заканадаўчай (па яго словах — цэнтральнай) і выканаўчай улады. У заключэнне Сталін палічыў неабходным падкрэсліць, што федэралізм у Расіі, —як і ў Амерыцы, і ў Швейцарыі адыграе —пераходную ролю да будучага сацыялістычнага ўнітарызма [5, с. 73]. Пры праглядзе гэтай сталінскай схемы адразу кідаецца ў вочы адсутнасць Беларусі ў пераліку суб'ектаў будучай Расійскай Федэрацыі. Сталін называў Польшчу, Украіну, Фінляндыю, Крым, Закаўказзе (дапускаючы яго распад на 3 адзінкі), Туркестан, Кіргізскі 88 край, Татара-Башкірскую тэрыторыю і нават Сібір. Але Беларусі ў ім не было [5, с. 69 – 70], як не было яе і ў іншых сталінскіх і наогул урадавых дакументах таго часу. Адну прычыну яе выпадзення мы ўжо ведаем: стварэнне рэспублікі ва ўмовах германскай акупацыі большай часткі Беларусі было непатрэбнай для савецкага ўрада і нават рызыкоўнай антыгерманскай дэманстрацыяй. Але неабходна назваць і другую прычыну. Як мы адзначылі вышэй, у пачатку снежня 1917 г. бальшавіцкае кіраўніцтва збіралася ствараць Беларускую савецкую рэспубліку. Але вопыт той першай спробы, якая завяршылася разгонам Усебеларускага з'езда, прымусіў яго ўсвядоміць, што ў Беларусі бальшавікі не маюць з кім ствараць такую рэспубліку. Беларускі абласны камітэт пры Ўсерасійскім савеце сялянскіх дэпутатаў, не з'яўляючыся бальшавіцкай арганізацыяй, спадзяванняў ленінскага ўрада не апраўдаў, а бальшавіцкі Аблвыкамзах наогул не ўспрымаў ідэю Беларускай рэспублікі. Не здолеўшы стварыць гэтую рэспубліку ў снежні 1917 г. па названай прычыне, савецкі ўрад вясной 1918 г., ва ўмовах германскай акупацыі большай часткі Беларусі, меў яшчэ менш падстаў, каб ствараць яе ці хоць бы дэклараваць яе стварэнне. Але з улікам перспектывы вызвалення Беларусі не выключалася сітуацыя, калі Беларуская савецкая рэспубліка аказалася б запатрабаванай. Менавіта з улікам гэтай перспектывы група беларускіх левых сацыялістаў была прынятая ў —школу Наркамнаца , у якім быў створаны беларускі аддзел - Беларускі нацыянальны камісарыят. Яго прызначэннем было гадаванне нацыянальных савецкіх кадраў [гл. 16, с. 4 – 15]. Аднак абмежаванне функцый Белнацкама культурна-асветніцкай і палітычнапрапагандысцкай працай (галоўным чынам сярод бежанцаў) сведчыла аб тым, што яго дзеячам адводзіцца дапаможная роля —спадарожнікаў савецкай улады, перадатчыкаў яе палітыкі ў беларускае нацыянальнае асяроддзе, але не стваральнікаў гэтай улады ў Беларусі. Беларускія нацыянальныя кадры не спатрэбіліся ў такой адносна самастойнай ролі нават у лістападзе – снежні 1918 г., калі Чырвоная Армія пайшла на Захад, а ў яе абозах адправіліся на тэрыторыі, якія пакідала Германія, эстонскі, літоўскі і латышскі савецкія ўрады. Усе яны былі створаны ў кабінеце Сталіна [17, с. 83 - 84]. Да ліку прычын гэтага выключэння Беларусі з ланцуга стварайшыхся савецкіх рэспублік, акрамя недаверу

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

ЦК РКП(б) да нешматлікай групы беларускіх нацыянал-камуністаў, далучыўся такі магутны фактар, як упэўненасць ленінскага кіраўніцтва ў паспяховым разгортванні сусветнай рэвалюцыі. Рашаць задачу яе прасоўвання на Захад лепш былі падрыхтаваныя старыя правераныя кадры камуністаў-інтэрнацыяналістаў з ПаўночнаЗаходняй арганізацыі РКП(б), тыя, што ў канцы 1917 г. разганялі Ўсебеларускі з'езд. Толькі прыкладна за тыдзень да новага 1919 г. сітуацыя прынцыпова змянілася: стала відавочна, што сусветная рэвалюцыя ў чарговы раз затрымліваецца, а ўнутраная контррэвалюцыя набірае небяспечную для бальшавікоў дынаміку. Тады і спатрэбілася Беларуская савецкая рэспубліка ў ролі палітычнага інструмента ЦК РКП (б) са сваім наборам палітычных задач. Як і адноўлены ўкраінскі савецкі ўрад, урад савецкай Беларусі быў пастаўлены ў прамое падпарадкаванне ЦК РКП(б), а яго кантралёрам ад ЦК, перадатчыкам дырэктыў партыйнага цэнтра, быў прызначаны адзін з арганізатараў разгону Ўсебеларускага з'езда А. Мяснікоў [18, с. 51; 19, л. 7]. На заканчэнне напрошваецца вывад аб тым, што абедзвюм савецкім рэспублікам – Украінскай і Беларускай – прызначалася роля палітычных інструментаў Савецкай Расіі, прызначаных служыць стабілізацыі бальшавіцкай улады і яе пашырэнню на захад. Пры гэтым беларускі інструмент ствараўся з разлікам на яго выкарыстанне для дасягнення новай ―перадышкі , неабходнасць якой для савецкай улады выявілася ў гэты час. На гэты раз яна была пажаданай у адносінах з Польшчай, пачаўшай сваю экспансію з захаду ў сітуацыі, калі сілы контррэвалюцыі наступалі з усходу. Узорам для выкарыстання на гэтым накірунку тактыкі перадышкі быў нядаўні вопыт германскай акупацыі Ўкраіны, адкуль немцы замест пажаданага імі хлеба, паводле Леніна, ―вывезлі рускі бальшавізм , рэвалюцыю, а ў дадатак яшчэ выбілі там (―вышибли ) нацыянальны рух [20, с. 160, 181; 21, с. 182]. 89 Крыніцы і літаратура 1. Карнейчык, Е., Папоў Ф., Шкляр М. В. І. Ленін і І. В. Сталін – арганізатары Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі / Е. Карнейчык, Ф. Папоў, М. Шкляр. - Мн., Дзяржвыдавецтва БССР, 1949. 2. Кульчицкий, С. В. УССР в 1917 - 1922 годах: характер и пределы советской национальной государственности / С. В. Кульчицкий. // Россия в ХХ веке: Проблемы национальных отношений. – М.: Наука, 1999. 3. Політична історія України: ХХ століття. – У 6 т. – Т. 2: Революції в Україні: політикодержавні моделі та реалії (1917 - 1920). – Київ : Вид. ―Генеза , 2003. 4. Ленин, В. И. Полное собрание сочинений. - Т. 34. 5. Сталин, И. В. Сочинения. – М.: Гос. изд-во полит. лит-ры, 1947 - Т. 4. 6. Михутина, И. Украинский Брестский мир / И. В. Михутина. - М.: Издат-во «Европа», 2007. 7. Известия, 1917. 8. Кнорын, В. Камуністычная партыя на Беларусі / В. Кнорын // Беларусь. Нарысы гісторыі, культуры і рэвалюцыйнага руху. – Мн., 1924. 9. Скалабан, В. Яўсей Канчар – палітык, гісторык, мемуарыст / В. У. Скалабан. - Беларуская Думка. - 2010. - №1. 10. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 60-п. – Воп. 3. – Спр. 231. 11. Ленин, В. И. Полное собрание сочинений. - Т. 35. 12. Ленин, В. И. Полное собрание сочинений. - Т. 36. 13. Советско-германские отношения от переговоров в Брест-Литовске до подписания Рапалльского договора: Сб. док. Т.1. (1917—1918 гг.). М., 1968. 14. Скрипник, М. Статті й промови. – Т.1: Пролетарська революція на Україні / М. Скрипник. - Харків: Державне вид-во України, 1930. 15. Никольников, Г. Л. Выдающаяся победа ленинской стратегии и тактики (Брестский мир: от заключения до разрыва) / Г. Л. Никольников. - М., 1968. 16. Лазько, Р. Белнацкам і Наркамнац: першы прыкры вопыт узаемаадносін / Лазько Р. // Беларускі гістарычны часопіс. - 2012. - №2. 17. Лазько, Р. Р. Паварот да новай ―перадышкі і абвяшчэнне БССР / Лазько Р. // Беларусь і суседзі: гістарычныя шляхі, узаемадзеянне і ўзаемаўплывы : міжнародная навук. канф. (2008, Гомель): матэрыялы / рэдкал. : Р. Р. Лазько (галоўны рэд.) і інш. - Гомель: УА ГДУ імя Ф. Скарыны, 2008. 18. Переписка секретариата ЦК РСДРП(б) с местными партийными организациями (ноябрь - декабрь1918 г.). Сб. документов. – М.: Гос. изд-во полит. лит-ры, 1970. 19. НАРБ. – Ф. 4-п. – Воп. 21. – Спр. 2534. 20. Ленин, В. И. Полное собрание сочинений. - Т. 37. 21. Ленин, В. И. Полное собрание сочинений. - Т. 38. Policy of the Soviet Russia concerning Belarus and Ukraine during the first period of Bolshevist dictatorship: parallels and differences. The government of the Soviet Russia began the policy concerning Belarus and Ukraine under the general scenario dissolution of the national organisations in system of councils was which idea. The failure of this scenario in December, 1917 and different character of a social support of Bolsheviks in Ukraine and in

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Belarus has forced Lenin's government to accept different variants of a policy on the Ukrainian and Belarus directions. Since spring of 1918 to the factors which have specified discrepancies in this policy, the different legal status of Ukraine and Belarus in the conditions of the German occupation However tool character of the Belarus and Ukrainian policy of the Soviet Russia was added has not changed.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ